

Малюнак А. ПАЎЛЯНКОВА.

# З Новым годам, дарагія сябры!

**Адыходзячы год быў асабліва радасным і знамянальным, поўным хвалюючых падзей. Краіна і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва ўрачыста адзначылі паўвяковы юбілей першай ў свеце сацыялістычнай дзяржавы. У гэтым годзе наш універсітэт стаў ардэнаносным. Радзіма высока ацаніла заслугі калектыва ў развіцці навукі і падрыхтоўцы кадраў.**

**Узнагарода натхніла нас на больш плённыя поспехі ў вучобе і працы. Новымі навуковымі адкрыццямі і значнымі дасягненнямі ў навуковай і выхаваўчай рабоце сустракаюць свята прафесары і выкладчыкі, большасць студэнтаў добра падрыхтавалася да зімовай экзаменацыйнай сесіі.**

**Пераступаючы парог новага года, мы поўны сіл і жадання яшчэ больш памнажаць славу ардэнаноснага універсітэта, запэўніваем Камуністычную партыю, Савецкі ўрад і ўвесь народ, што і далей будзем высока несці сцяг перадавой савецкай навукі.**

**Дарагія сябры! Сардэчна віншуем вас з Новым годам! Жадаем плённай працы, выдатнай вучобы, добрага здароўя і асабістага шчасця!**

ПАРТКОМ
РЭКТАРАТ

МЯСЦКОМ
ПРАФКОМ

КАМІТЭТ
КАМСАМОЛА

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГОД ВЫДАННЯ XXI
1967 г.
29 снежня
ПЯТНІЦА
№ 39 (691)
ЦАНА 2 КАП.

# СВЯТА ПАЧАЛОСЯ

На два пытанні нашага карэспандэнта даў адказы старшыня мясцкома дацэнт І. Т. Рагоўскі. Вось яны:

**— Як будзе адзначацца Новы год ва універсітэце?**

— Па сутнасці, свята ў нас ужо пачалося. Учора ў тэатры оперы і балета адбыўся агульнауніверсітэцкі навагодні вечар выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

— А для дзяцей навагодні ранішнік пачынаецца 1 студзеня ў 11 гадзін у лялечным тэатры. Іх чакаюць Дзед Мароз са Снягуркай, якія ўжо гатовы весці карагоды вакол ёлкі, і паклікаць сваіх юных сяброў на спектакль «Арэхавы пруток». І, безумоўна, дзецям мы рыхтуем падарункі.

**— Што б Вы хацелі пажадаць выкладчыкам і супрацоўнікам у новым годзе?**

Здароўя, поспехаў у працы, асабістага шчасця! Мясцком жадае, каб у 1968 годзе многія змаглі адпачыць у санаторыях па нашых пуцёўках, а тыя, што не маюць уласнай кватэры, атрымалі яе.

# ЗАЎЖДЫ Ў ПАХОДЗЕ

**Вучоны і спартсмен, педагог, паэт, былы воін. Хто гэта! На геолага-геаграфічным факультэце адразу назавуць імя Віктара Рыгоравіча Заўрыева.**

**Так, так, загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін Віктар Рыгоравіч Заўрыеў вядомы чалавек, любімы выкладчык. Багаты вопыт, шырыня поглядаў і інтарэсаў, сардэчныя адносіны да людзей заваявалі сэрцы калег і студэнтаў.**

**У наш універсітэт Віктар Рыгоравіч прыйшоў у 1961 годзе. А да гэтага многія гады працаваў у Азербайджане.**

**У час Вялікай Айчыннай вайны — ён у радах Савецкай Арміі, удзельнічаў у Сталінградскай бітве, вызваляў ад захопнікаў Варшаву, ваяваў у Германіі. За мужнасць і адвагу Віктар Рыгоравіч Заўрыеў узнагароджан ордэнам Айчыннай вайны першай ступені, двума ардэнамі Чырвонай Зоркі, некалькімі медалямі.**

**Пасля вайны салдат зноў становіцца вучоным. У інстытуце геаграфіі АН СССР Віктар Рыгоравіч абараняе доктарскую дысертацыю.**

**Калі стала патрэбнай дапамога савецкіх спецыялістаў-геаграфаў В'етнаму, ён едзе ў гэтую краіну, нястомна працуе на карысць в'етнамскага народа.**

**Ва універсітэце прафесар Заўрыеў вядзе вялікую грамадскую работу. Ён віцэ-прэзідэнт геаграфічнага таварыства Беларускай ССР, папулярны лектар таварыства «Веды». У той жа час Віктар Рыгоравіч паспявае аддаць даніну сваім захапленням, сярод якіх—паэзія, спорт, фота- і кіназдымкі.**

**У студзені Віктар Рыгоравіч Заўрыеў адзначыць свой 60-гадовы юбілей. Хочацца ад усёй душы пажадаць яму выдатнага здароўя і вялікіх поспехаў у яго шматграннай дзейнасці.**

**І. ІВАНКІН,**
**студэнт другога курса геолага-геаграфічнага факультэта.**



*Напярэдадні навагодняга свята гэтых студэнтаў можна было ўбачыць у розных школах Мінска. Будучыя настаўнікі давалі ўрокі геаграфіі.*

*Зараз яны сабраліся ў кабінеце фізічнай геаграфіі СССР, каб абмеркаваць вынікі практыкі з метадыстам Сідарам Сафронавічам Каўшэрам.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

# ЦЯПЛО ДУШЫ—ЛЮДЗЯМ

Дацэнт кафедры паліт-эканоміі Пётр Усцінавіч Грышановіч нядаўна размяніў сёмы дзесятак свайго жыцця. За 40 год сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці ён нямала зрабіў у справе выхавання маладых спецыялістаў.

І той, хто прайшоў праз рукі Пятра Усцінавіча, абавязкова адчуў цеплыню яго бацькоўскага сэрца, нястомную працу вучонага па перадачы сваіх багатых ведаў.

Пры сустрэчы, пры выпадковай размове Пётр Усцінавіч не праміне запытаць пра справы, пра цяжкасці, і калі толькі ў голасе пачуе незадаволенасць, якое-небудзь перажыванне — не адступіць да таго часу, пакуль не даведаецца, у чым гэтая цяжкасць. Абавязкова што-небудзь параіць, падбадзёрыць, прапануе сваю дапамогу. А хто з маладых не ведае, што азначае рука старэйшага, яго дапамога! Такой думкі аб Пятру Усцінавічу як былыя аспіранты — Ул. Кулажанка, Б. Ямелін, Э. Шастаковіч, так і цяперашнія—П. Якубовіч, І. Баржэеў, Я. Каваленка, А. Глебаў і іншыя.

Віншуючы Пятра Усцінавіча з Новым годам, яны выказваюць яму вялікую падзяку за падтрымку і дапамогу і жадаюць доўгіх год жыцця, моцнага здароўя і плённых поспехаў на навукова-педагагічнай ніве.

**Ул. СІЛІН.**

# 1967 летапіс нашага жыцця

**Незабыўнай радаснай падзеяй быў азнаменаваны для універсітэта 1967 год. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7 студзеня за заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўцы спецыялістаў старэйшая навучальная ўстанова Беларусі ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Праз тры дні вялікая інтэрнацыянальная сям'я прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў, рабочых і служачых сабралася на ўрачысты мітынг. Выступіўшыя на мітынгу ветэран універсітэта акадэмік Т. М. Годнеў, прафесар Л. С. Абэцэдарскі, дэкан фізфака І. П. Зяцькоў, студэнтка філфака Ніна Царэнка і іншыя сардэчна дзякавалі партыю і ўрад за высокую ацэнку працы нашага калектыву, запэўнілі Радзіму, што створаны ў адпаведнасці з ленінскім дэкрэтам Беларускі універсітэт і надалей будзе ісці ў першых шарэнгах будаўнікоў камунізма.**

**△ 8 СТУДЗЕНЯ паспяхова здалі свой першы экзамен студэнты яшчэ аднаго адкрытага ва універсітэце аддзялення — філасофскага.**

**△ 12 СТУДЗЕНЯ біёлагі падвялі вынікі падрыхтоўкі навуковых кадраў на факультэце за апошнія 10 год. Аказалася, што за гэты кароткі час абаронена 80 дысертацый.**

**△ У 1967 годзе споўнілася 40 год аспірантуры пры універсітэце. Цяпер у ёй займаецца звыш 400 чалавек.**

**△ Загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прафесар В. І. Сцяпанаў выбран членам-карэспандэнтам АН БССР.**

**△ За заслугі ў развіцці вышэйшай адукацыі і падрыхтоўцы кадраў дэкан біялагічнага факультэта дацэнт П. Р. Пятровіч узнагароджан ордэнам Леніна. Прафесары Л. І. Фігloўская і У. М. Сікорскі атрымалі ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, доктар навук прарэктар Л. В. Валадзько атрымаў медаль «За працоўную доблесць».**

**△ У час зімовых канікул універсітэцкія артысты прынялі ўдзел у Ленінградскім фестывалі самадзейных мастацкіх калектываў. Пасланцы БДУ занялі чацвёртае месца сярод універсітэтаў краіны. Фестываль быў прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады.**

**△ Фінішавала XV юбілейная спартакіяда. За 1967 год ва універсітэце падрыхтавана 79 майстроў і кандыдатаў у майстры спорту і 1520 разраднікаў.**

# 1967 летапіс нашага жыцця

△ На стацыянары экзамены ў зімовую сесію здавала 5676 студэнтаў. Паспяхова вытрымала справаздачу 4811 чалавек. Колькасць выдатнікаў на матэматычным факультэце ўзрасла да 153, на фізічным—да 137. Паспяховасць па універсітэту склала 84,7 працэнта.

△ У 1965 годзе літаб'яднанне пры газеце «Беларускі універсітэт» адзначыла два гады свайго існавання і ўпершыню выйшла на рэспубліканскую арэну — быў выдадзен зборнік вершаў «Узлёт». Днямі выйдзе з друку другі зборнік—«Натхненне».

△ Ва універсітэце праведзена першая зімовая спартакіяда выкладчыкаў. Прызавыя месцы занялі супрацоўнікі фізфака, матфака і біяфака. Спартакіяда праходзіла пад дэвізам дастойнай сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады.

△ 21 сакавіка. Гэты дзень застанецца ў памяці на усё жыццё. На урачыстым вечары студэнтаў і выкладчыкаў сумесна з прадстаўнікамі партыйных, савецкіх органаў і грамадскасці сталіцы першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў уручыў універсітэту ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

△ За заслугі ў развіццi навукі і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў рэктару універсітэта прафесару А. Н. Сеўчанка прысвоена ганаровае званне Заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР.

△ Выкладчык універсітэта Заслужаны ўрач БССР І. А. Кажанкоў — удзельнік V Усерасійскага з'езда Саветаў, на якім выступаў У. І. Ленін. 21 красавіка ветэран рэвалюцыі выступіў у нашай газеце з успамінамі аб сустрэчах з Ільічом.

△ У красавіку ў БДУ адбыўся сімпозіум славістаў. У ім прынялі ўдзел госці з Масквы, Ленінграда, Львова, Варонежа, Алма-Аты і многіх іншых гарадоў. У Беларусі, пытанні славістыкі абмяркоўваліся ўпершыню.

△ У першамайскай калоне універсітэта былі прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей СССР і пасланцы 16 замежных краін.

△ У выніку агляду-конкурсу насценнага друку, які адбыўся ў пачатку мая, першае месца падзялілі «Слова філолага» і «Віта» (біяфак); на другім месцы—«Гісторык»; трэцяе заваявалі географы («Мерыдыян»).

△ У маі адбылася агульнауніверсітэцкая навуковая сесія прафесарска-выкладчыцкага саставу, прысвечаная юбілею Савецкай улады. Абмеркавана каля 300 дакладаў і паведамленняў.

△ У пачатку чэрвеня выйшаў рукапісны студэнцкі навукова-публіцыстычны альманах «Творчасць журналістаў». Яго аўтары — члены навуковага гуртка пры кафедры тэорыі і практыкі партыйнага друку. Ва універсітэце навукова-даследчай працай займаецца звыш тысячы студэнтаў.

△ 10 чэрвеня студэнты і прафесары сардэчна віталі ў сценах універсітэта удзельнікаў дэкады літаратуры і мастацтва Узбекістана. Ад імя гасцей выступала народная паэтэса Зульфія.

△ 30 чэрвеня адбылася другая рэспубліканская канферэнцыя матэматыкаў. З дакладам «Развіццё матэматыкі ў БССР за 50 год» выступіў прафесар Д. А. Супруненка.

△ Звыш 4000 студэнтаў універсітэта прыняло ўдзел у працоўным семестры, які ў гонар 50-годдзя Савецкай улады быў аб'яўлен ударным. Нашы будаўнічыя атрады выязджалі у Польшчу, Чэхаславакію, ГДР.

△ Верасень 1967. На першы курс дзённага, вячэрняга і завочнага навучання залічана амаль тры з паловай тысячы чалавек па 15 спецыяльнасцях.

△ З першага верасня пачаў сваё жыццё новы факультэт — журналістыкі.

△ Звыш 700 камуністаў і беспартыйных першага кастрычніка пачалі вучобу ў сетцы палітычнай асветы.

△ 12—13 кастрычніка ва універсітэце адбылася рэспубліканская навуковая студэнцкая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады. 32 прадстаўнікі універсітэта выйшлі пераможцамі агляду. Яны узнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі.

△ Напярэдадні 50-годдзя Кастрычніка ў Іене (ГДР) падпісан дагавор аб супрацоўніцтве паміж нашым універсітэтам і універсітэтам імя Ф. Шыллера.

△ 7 лістапада калектыў ордэнаноснага універсітэта разам з усім савецкім народам і прагрэсіўным чалавецтвам урачыста адзначыў 50-гадовы юбілей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

△ Агульнасаюзны Савет па справах замежных навучэнцаў і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прызналі наш універсітэт лепшым у арганізацыі інтэрнацыянальнай работы па выніках агляду, праведзенага ў гонар 50-годдзя Савецкай улады. Універсітэт узнагароджан Ганаровай Граматай.

△ 1 снежня Вучоны Савет універсітэта вылучыў у акадэмікі Акадэміі педагагічных навук СССР прафесараў І. М. Лушчыцкага і Л. С. Абэцэдарскага, у члены-карэспандэнты — прарэктара па вучэбнай рабоце гуманітарных факультэтаў дацэнта С. А. Умрэйку.

# НА АСПІРАНЦКІМ СКРЫЖАВАННІ



## Сардэчнае дзякуй

Калі я скажу, што 1967 год быў самым шчаслівым у маім жыцці—гэта не будзе перабольшаннем. Памяркуйце самі. Сёлета я абараніў кандыдацкую дысертацыю. Прычым, абараніў датэрмінова, за два месяцы да сканчэння вучобы ў аспірантуры. Радасць узрастае яшчэ ад таго, што абараняўся я на першым пасяджэнні новага, толькі што створанага Вучонага Савета філалагічнага факультэта, і дыплом кандыдата навук, які мне прыслалі з Масквы якраз напярэдадні Новага года, мае першы парадкавы нумар.

З 1967 года пачынаецца і мая працоўная біяграфія: я залічаны выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры. Наша кафедра дружная, надзвычай працаздольная і аўтарытэтная. З дванаццаці яе членаў адзінаццаць маюць навуковыя ступені, шэсць чалавек—члены Саюза пісьменнікаў. Так што навучыцца, пераняць вопыт працы, і педагагічнай і навуковай, ёсць у каго. Зрэшты, гэтая навука, гэты вопыт мне ўжо вельмі дапамаглі. У маіх сціплых навуковых поспехах—вялікая заслуга кіраўніка дысертацыі прафесара Міхася Рыгоравіча Ларчанкі, добрага дарадчыка, знаўца паэзіі дацэнта Алега Антонавіча Лойкі, усіх членаў кафедры, якія зацікаўлена абмяркоўвалі дысертацыю, дапамагалі мне ў працы. Вельмі ўдзячны я таксама дацэнту Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Івана Франка Івану Аксенцьевічу Дзенісюку, незаменнаму кансультанту па многіх пытаннях сучаснага літаратуразнаўства. З ім нас пазнаёміла Шаўчэнкаўская студэнцкая канферэнцыя 1961 года ў Львове, куды я ездзіў па накіраванню СНТ нашага універсітэта. Вялікае дзякуй, дарагія настаўнікі! Усяго самага найлепшага вам у новым годзе!

Быў сёлетні год радасным і на падзеі больш асабістыя, інтымныя. Аднак гэта ўжо, думаю, не асабліва цікава для чытачоў «Беларускага універсітэта»...

**В. РАГОЙША,**
**выпускнік аспірантуры БДУ ў 1967 годзе, кандыдат філалагічных навук.**



## «ПАДВЯЛІ» ВЫКЛАДЧЫКІ

Мінулы год быў для мяне адным з самых знамянальных: пасля нялёгкіх і шматлікіх мук я закончыў завочнае аддзяленне філасофіі і нават атрымаў дыплом выдатніка. Прызнаюся: вельмі цяжкім быў фініш, ды і ўсе гады вучобы адабралі многа сіл. Можна было б і адпачыць... Я аб гэтым часта думаў, але адпачынак не атрымаўся. Адразу пасля дзяржаўнага экзамена прышлося зноў сесці за кніжкі.

Ва ўсім вінаваты выкладчыкі. Гэта яны за доўгія шэсць гадоў абудзілі ў мяне нязгасную любоў да філасофіі. Ужо дзесьці на трэцім курсе зразумеў, што не змагу без яе жыць.

Неяк пасля абароны дыпломнай працы мяне запрасіў на размову прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі і прапанаваў падумаць аб аспірантуры. Я ўзрадаваўся і... разгубіўся. Бачачы маю няёмкасць, Іван Мікалаевіч дадаў у канцы гутаркі:

— Філасофія дае чалавеку тры дары, як вучылі грэкі—дар добра мысліць, дар добра гаварыць і дар добра дзейнічаць. Адчуваецца, першыя дзве здольнасці ў вас ужо ёсць...

Не мог жа я разарваць на часткі гэты цудоўны афарызм. У чэрвені атрымаў дыплом, а ў кастрычніку—пасведчанне аспіранта кафедры гісторыі філасофіі і логікі. Здаецца, гэта было зусім нядаўна, але я ўжо паспеў атрымаць першую ацэнку, на выдатна здаў экзамен кандыдацкага мінімума па замежнай мове. Выбраў і тэму навуковага даследавання, кіраўніком згадзіўся быць Іван Мікалаевіч.

Дык вось: калі ў мяне дысертацыя атрымаецца, то вінаватымі ў гэтым будуць выкладчыкі. Сардэчна віншую іх з Новым годам, дзякую за веды, жадаю, каб яны часцей вось так «падводзілі» сваіх выхаванцаў.

**С. ШАШ,**
**аспірант першага года навучання.**

# ІНТЭРВ'Ю пад Новы год

*Кажуць, што лірыкі — гэта летуценнікі. Аб чым жа мараць яны ў гэтыя перадсвяточныя дні? Што было адметным для іх у мінулым годзе?*

*Думкамі і ўспамінамі дзеляцца маладыя паэты-аднакурснікі філалагічнага факультэта Мар'ян Дукса, Сяргей Законнікаў і Міхась Губернатараў.*

## Мар'ян ДУКСА:

Год, які вось-вось адшалясціць апошнімі каляндарнымі лісткамі, для мяне памятны. Сёлета выйшаў з друку мой першы зборнік вершаў «Спатканне». Зразумела, сябры ціснуць рукі, усклікаюць «брава!». Крытыкі адразу паклалі зборнік на аперацыйны стол — літаратурная хірургія цяпер на вышыні. Мне раяць: не хвалюйся. Гэта азначае: выразай з газет усемагчымыя рэцэнзіі, складай у тумбачку і напявай: «Эх, архіўчык, мой архіўчык!..»

У 1967 годзе я ў складзе студэнцкага будаўнічага атрада ўзводзіў на Случчыне лазню, пабываў у тайзе, падарожнічаў па мядзвежых сцежках і спяваў сібірскім дзяўчатам «Ручнікі». Адным словам, мой лірычны герой растраціў увесь ганарар на дарогі. І разам з тым, паўтараю, 1967 год — адзін з лепшых і слаўных. Шмат пабачыў, адчуў, шмат зорак пералічыў на вясковых і гарадскіх лаўках.

Чаго хачу ад 1968 года! Хай ён будзе мірным, але неспакойным для душы і сэрца. Хай народзяцца новыя вершы. Светлыя і арыгінальныя. І яшчэ хачу. Няхай май будзе сонечным.

## Сяргей ЗАКОННІКАЎ:

Год канчаецца, а клопаты толькі пачынаюцца. Сесія наступае на пяткі. Як тут не захвалявацца, калі па праграме трэба яшчэ прачытаць кіпы рознай літаратуры. Адна «Зачараваная душа». Р. Ралана — аж пяць кніжак! Хоць і няма часу, ды трохі паўспамінаю.

Гэты год быў для мяне багаты на падзеі. Летам пабываў на цаліне, ва Уральскай вобласці. Многа пабачыў, многа пачуў і крыху менш напісаў.

У памяці захаваліся сустрэчы з чабанамі, студэнтамі Уральскага педінстытута, перасяленцамі - беларусамі. Яшчэ зараз у вушах гучаць мелодыі цалінных песень, сняцца па начах саман і скарпіёны, вярблюды і бараны. Нават у вершах не магу адбіцца ад такой рыфмы: баран — саман — чабан — айран. Я вельмі рад, што на цаліне са мной побач былі цудоўныя таварышы, мае калегі-філолагі. Хочацца сказаць дзякуй нашаму цяперашняму сакратару камітэта камсамола Олі Гарашчук за тыя 1200 кубкаў чаю, што мне давялося выпіць за час цаліны. Чай Олі — гэта пітво багоў.

Па прыезду з Уральска мяне чакала прыемная навіна. Ва універсітэт паступілі брат і сястра.

У кастрычніку пабываў у Літве. Наогул, я лічу, што трэба больш падарожнічаць. Дарога — гэта новыя мары, новыя людзі.

Спадзяюся, што ў новым годзе паездак і сустрэч будзе болей. Кожны чалавек чакае, што новы год прынясе многа-многа шчасця. Я жыву такімі ж надзеямі. Хай радасць не абыйдзе ніводную хату на зямлі!

Ну, і на астатку пра вершы. У першым студзеньскім нумары новага года ў часопісе «Маладосць» будзе надрукавана мая новая падборка. Рыхтую першую кніжку. Але вось ніяк не прыдумаю назвы. Можа хто, прачытаўшы гэтыя радкі, працягне руку дапамогі?

## Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ:

Я (грэх няхай будзе за мной) незнарок падслухаў размову маіх сяброў, іх успаміны аб мінулым годзе. І думаю: бач ты, — не паспеў агледзецца, а яны ўжо— класікі. А мне, здаецца, няма чым і пахваліцца. Адзін (я маю на ўвазе Мар'яна Духсу) радуецца свайму першаму зборніку, а Сяргей Законнікаў гатоў расцалаваць кожнага, хто знойдзе яму крылатую назву для кнігі.

Я задумаўся. З чаго б пачаць пералік маіх літаратурных падзей? Што было найбольш адметным?

Па-першае, трэба пералічыць, колькі разоў надрукаваўся і дзе. Гэта мяне ў нейкай ступені суцяшае: ад сяброў не адставаў. Пабываў у многіх камандыроўках. Пабачыў таксама нямала. Кідаў доўгія падборкі ў «Магілёўскую праўду», друкаваўся пастаянна ў «Чырвонцы», выступіў у «Полымі» і «Маладосці». А зусім нядаўна з'явілася падборка вершаў у газеце «Голас Радзімы».

Але не хочацца пералічваць старое.

Што свеціць мне ў новым годзе? Выступлю ў «Полымі», «Маладосці» і іншых выданнях. Таксама рыхтую зборнік і чакаю сваёй вясны.



*Перад Новым годам выпускнікі факультэта журналістыкі паспяхова вытрымалі адзін са сваіх апошніх экзаменаў ва універсітэце — дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму.*

*НА ЗДЫМКУ: перад камісіяй—Ф. Кулакоў.*

*Фота І. АСКІРКІ.*



*Лаўрэат Усесаюзнага фестывалю — танцавальны калектыў в'етнамскіх студэнтаў нашага універсітэта.*

# З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, ВАСІЛЬ КУЗЬМІЧ!

Іван Фёдаравіч, начальнік аддзела кадраў, усміхнуўся, калі я спытаў у яго, ці ёсць ва універсітэце супрацоўнікі, якія нарадзіліся 1 студзеня.

— Што, на імяніны захацелі? — пажартаваў Іван Фёдаравіч. — Вам пашанцавала. Інспектару вучэбнай часткі Станкевічу 1 студзеня спаўняецца пяцьдзесят год...

— Васілю Кузьмічу? Пяцьдзесят год? Не-е-е, гэтаму цяжка паверыць.

Іван Фёдаравіч дастае папку і чытае: «Станкевіч Васіль Кузьміч нарадзіўся ў вёсцы Міхедавічы Петрыкаўскага раёна 1 студзеня 1918 года».

— Цяпер верыце?

— Не зусім.

...Васіль Кузьміч рассмяяўся, калі я расказаў яму аб нашай размове ў аддзеле кадраў:

— Што ж, мяне сяды-тады называюць маладым чалавекам. Дапамагае маладцаватая выпраўка. Як ні як, а я каля трыццаці гадоў служыў у арміі. Можа тут трэба шукаць сакрэт маёй бадзёрасці? Але...

Вось аб гэтым «але» і хацелася б расказаць падрабязней.

Палескія палі не радавалі сялян ураджайнасцю, а ў Станкевічаў было шэсць дзяцей. Па адной лыжцы— і ўжо міскі супу няма. Дзесяцігадовым хлапчуком пачаў працаваць Васіль у заможнага аднавяскоўца, але на сябе не зарабляў.





У 1929 годзе ў Міхедавічах быў створан калгас «Сейбіт». У ліку першых калгаснікаў — Станкевічы. Васіль пайшоў у школу, а ў вольны час дапамагаў бацькам: пасвіў калгасны статак, вазіў жыта... Працы хапала ўсім, і яна не перашкаджала вучобе.

Можа, так і застаўся б хлапец у калгасе (ён вельмі рана праявіў здольнасці хлебароба), але аднойчы ў вёску прыехаў прадстаўнік з Мінска. Ён звярнуўся да праўлення з просьбай дапамагчы будоўлям сталіцы рабочай сілай. Васіля Станкевіча рэкамендавалі першага. Так у 1934 годзе ён апынуўся ў Мінску. Узводзіў будынак Дома афіцэраў і адначасова вучыўся на рабфаку універсітэта. Потым паступіў у педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай. Меў намер вярнуцца настаўнікам у родную вёску.

І зноў «але». У 1939 годзе па закліку камсамола група студэнтаў падае калектыўную заяву ў ваеннае вучылішча, у іх ліку і Станкевіч.

Выпуск быў датэрміновым: пачалася вайна.

Малады камандзір у Ленінградзе. Да самага канца прарыву блакады абараняў ён горад Леніна. Пачаў са ўзвода, а пасля вадзіў у бой батальён. Быў двойчы паранены.

— Як ваяваў?... — Васіль Кузьміч на хвіліну задумаўся. — Як усе. У Ленінградзе героямі станавіліся і дзеці.

Два ордэны Чырвонай Зоркі, восем медалёў—так адзначыла Радзіма подзвігі былога палескага пастуха.

І усё ж ён стаў настаўнікам. У 1944 годзе Васіль Кузьміч быў адазваны ў сістэму сувораўскіх вучылішчаў і да канца 1965 года працаваў педагогам — выкладчыкам. Цяпер — інспектар па вучэбнай рабоце ва універсітэце. Багаты армейскі вопыт дапамагае штодзённа вырашаць шматлікія пытанні.

Дарэчы, сувязі з арміяй Васіль Кузьміч не парывае. Ён часта сустракаецца з воінамі, выступае перад імі з успамінамі.

Па шляху бацькі пайшлі сыны. Старэйшы, Уладзіслаў, — афіцэр, а малодшы, Мікалай, — выпускнік аднаго з вышэйшых інжынерных ваенных вучылішчаў. Вось на Новы год і з'едуцца ў Мінск, каб разам правесці свята і павіншаваць бацьку з 50-годдзем.

Мы таксама сардэчна віншуем юбіляра, жадаем яму яшчэ гадоў на пяцьдзесят застацца такім жа жыццярадасным, бадзёрым і маладым.

**С. РУДЗЕНСКІ.**

**На здымках:** Васіль Кузьміч Станкевіч (першы здымак зроблены ў 1939 годзе, другі — перад дэмабілізацыяй, у 1965 годзе).

# РАСКАЗВАЮЦЬ І ВІНШУЮЦЬ ГОСЦІ

**Напярэдадні Новага года ў нашым універсітэце адбыўся канцэрт фальклорнай групы Ансамблю песні і танца Саюза Камуністычнай Моладзі Румыніі, які прайшоў з вялікім поспехам.**

**Наш карэспандэнт Анатоль Ярохін звярнуўся з некаторымі пытаннямі да аднаго з кіраўнікоў групы— заслужанага артыста Румыніі Тэадора Васілеску:**

**— Раскажыце, калі ласка, аб сваім калектыве і планах на будучае.**

**— Да прыезду ў Мінск наша група (дарэчы, гэта так і ёсць, таму што мы— толькі частка ансамблю, яго фальклорная група) была ўжо ў Маскве, Пскове, Вільнюсе.**

**Ансамбль прымаў удзел у міжнародных фестывалях моладзі ў гарадах Будапешце, Бухарэсце, Берліне, Варшаве, Вене і Хельсінкі. Кожны раз ансамбль займаў прызавыя месцы. А танцавальная група ансамблю тройчы заваёўвала залатыя медалі.**

**У рэпертуары ансамблю— творы класічнай музыкі, сучасныя песні аб міры, новыя танцы.**

**Тое, што вы толькі бачылі, —фальклорная група. Яе мэтай было і застаецца— распаўсюджваць народнае мастацтва, якім так багата наша радзіма. Адсюль і вынікаюць нашы планы на будучае.**

**— Слухачы вельмі цёпла ўспрымалі вашы выступленні. Па заключэнню канцэрта вы чулі многа цёплых слоў удзячнасці і пажаданняў вашаму калектыву. Якія будуць у вас пажаданні для студэнтаў універсітэта ў сувязі з надыходзячым Новым годам і пачаткам зімовай сесіі!**

**— З выпадку Новага года мы жадаем студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта самых лепшых поспехаў у здачы экзаменаў, якія тут, як і ўсюды, пачынаюцца адразу ж пасля Новага года! Жадаем ім добрага здароўя і найлепшых поспехаў у жыцці! Надоўга зберажэм цяпло, якім акружалі нас у вашым універсітэце!**



*Госці на сцэне.* *Фота Ф. ЗЯЗЮЛІ.*

# ВЯСНА НАЦЫІ

*ДАРАГАЯ РЭДАКЦЫЯ! Скора наступіць Новы год. А ў нас, у В'етнаме, з Новым годам прыходзіць і вясна. Прапаноўваю вам заметку, якую напісаў студэнт падрыхтоўчага факультэта Нгуен Дзінь Вінь. Яна прысвячаецца вясне. Калі палічыце магчымым, калі ласка, надрукуйце яе на старонках вашай газеты. Добра, калі гэта будзе навагодні нумар.*

*З павагай*

*НГУЕН ХАК ТХІ.*

Мы задаавльняем просьбу Нгуен Хак Тхі і прапаноўваем нашым чытачам заметку Нгуен Дзінь Вінь.

**У нашай краіне наступае вясна. Яна заўсёды прыгожая. Але цяпер вы зможаце ўбачыць прыгажосць вясны не толькі ў маладых расцвіўшых зелянню персікавых галінках, радасным шчабятанні птушак, прыгажосць вясны яшчэ ярчэй акрэсліваецца ў самаадданых подзвігах мужных людзей на франтах працы і бою. Прыгожыя і «сярэбраныя ластаўкі», што носяцца ў бясконцым вясеннім прасторы. Яны накіроўваюць свой агонь супраць амерыканскіх піратаў. Прыгожыя стальныя артылерыйскія ствалы — грозныя «сланы», якія ахоўваюць неба і мора Радзімы.**

**Вы можаце пазнаць прыгажосць вясны не толькі па ўсмешках дзяўчат, поўных любві і пяшчоты. Вы знойдзеце яе ў вачах дзяўчыны-апалчанкі з вінтоўкай у руках, якая назірае за амерыканскімі самалётамі; па ўсмешках зянітчыкаў, ракетчыкаў, што паспяхова закончылі бой.**

**Прыгажосць в'етнамскай вясны ўсё мацней, яна глушыць бомбы і плач. Гэтая прыгажосць цёплая, ласкавая, але яна мае здзіўляючую знішчальную сілу, якая прымушае ворага дрыжаць ад страху.**

**Амерыканскія агрэсары спрабуюць бомбамі знішчыць вясну, але іменна іх, ашалелых, топіць вясна сваёй сілай.**

**Зялёны цвет палёў і трапічных дрэў сцірае сляды, што пакінулі бомбы і снарады.**

**Шуміць мора, яно поўнае абурэння да амерыканскіх агрэсараў.**

**Ціхія і прыгожыя, як вясковыя дзяўчаты, рэкі бягуць да мора, адлюстроўваючы ў сябе мужнасць выратаваных мастоў і цяжкіх эшалонаў, якія спяшаюцца на фронт, насустрач вясне вызвалення, якая не сёння, дык заўтра прыйдзе. Несумненна прыйдзе. І гэта будзе вясна нацыі.**

**НГУЕН ДЗІНЬ ВІНЬ.**

## З Новым годам!

# ЗАГЛЯНЕМ У БУДУЧЫНЮ

*Роўна дзесяць год назад у перадиавагоднім інтэрв'ю рэктар універсітэта расказваў аб перспектывах развіцця фізіка-матэматычнага факультэта. Тады яшчэ ў планах было раздзяленне факультэта на два (фізічны і матэматычны), будаўніцтва новага памяшкання, стварэнне разнастайных лабараторый, шырокая спецыялізацыя.*

*Цяпер планы сталі рэчаіснасцю, і каб ярчэй расказаць аб гэтым, рэдкалегія насценнай газеты «За навуку» у навагоднім нумары змясціла побач два інтэрв'ю — дзесяцігадовай даўнасці і сённяшняга дня, якое дас дэкан фізічнага факультэта І. П. Зяцькоў.*

*Якія ж цяпер перспектывы развіцця самага вялікага факультэта ва універсітэце?*

*Чатырнаццаць кафедр забяспечваюць падрыхтоўку студэнтаў па ўсіх прадугледжаных вучэбнымі планамі спецыялізацыях. Шмат увагі будзе ўдзелена навукова-даследчай рабоце студэнтаў, падрыхтоўцы кадраў выкладчыкаў вышэйшай кваліфікацыі — дактароў і кандыдатаў навук.*

*Зараз праблемная лабараторыя паўправаднікавай тэхнікі, навукова-даследчыя лабараторыі пры кафедрах ядзернай фізікі, фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу, электрафізікі, радыёфізікі і электронікі і іншыя аб'ядноўваюць каля 200 навуковых супрацоўнікаў і інжэнерна-тэхнічных работнікаў.*

*Далучэнне універсітэта да ліку дваццаці пяці перадавых вузаў краіны дазволіць значна павялічыць штаты навуковых супрацоўнікаў гэтых лабараторый. Апошнія побач с рашэннем шэрагу актуальных праблем фізікі сённяшняга дня з'явяцца асноўнай базай курсавога і дыпломнага праектавання па навуковай тэматыцы.*

*У далейшым плануецца аб'яднаць праблемную лабараторыю паўправадніковай тэхнікі, навукова-даследчыя лабараторыі пры кафедрах фізічнага і матэматычнага факультэтаў у навукова-даследчы інстытут фізікі і матэматыкі пры нашым універсітэце. Гэта дазволіць яшчэ шырэй разгарнуць навуковыя даследаванні і рашыць праблему падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.*

# ДЛЯ ВАС, СТУДЭНТЫ

**З асабістага вопыту ведаю, што ніхто з вас не ўтрымаецца, каб у навагоднія святы не выпіць чарку-другую... гарэлкі. Гэта, як даказваюць у апошні час добра дасведчаныя дактары, не ідзе на карысць здароўю. Да таго ж, яно намнога пахіснецца за час сесіі з яе бяссоннымі начамі, з «сухім пайком».**

**Улічваючы ўсё гэта і паважаючы вас, яшчэ задоўга да Новага года я даручыў прафкому паклапаціцца аб вашым здароўі, заказаць як мага больш пуцёвак у дамы адпачынку і санаторыі на час зімовых канікул. Не думайце, што гэта навагодні жарт, а хутчэй нясіце ў прафком свае заявы. Яны прымаюцца толькі да 10 студзеня новага, 1968 года.**

**ДЗЕД МАРОЗ.**

